мере сопоставим с партизанским движением в Беларуси в 1942 г., во время Великой Отечественной войны.

**Использованная литература**

1. Память. Историко-документальные хроники районов Беларуси: в 140 книгах. – Мн., 1987-2009.

## ПЕРАДУМОВЫ, ПРЫЧЫНЫ І ЭТАПЫ СТВАРЭННЯ ЛІТОЎСКА-БЕЛАРУСКАЙ ССР

Багалейша С. В. г. Мінск, БНТУ

Літоўска-Беларуская ССР праіснавала вельмі непрацяглы час, але, нягледзячы на гэта, пытанні, звязаныя з яе стварэннем і дзейнасцю, месцам гэтага дзяржаўнага ўтварэння ў айчыннай гісторыі, да сённяшняга часу выклікаюць пільную ўвагу і дыскусіі сярод беларускіх і літоўскіх даследчыкаў. Дадзеныя, якія ўзгадваюцца ў навуковай літаратуры, вельмі розняцца паміж сабою, а ў асобных выпадках з'яўляюцца ўзаемавыключнымі.

Перш чым разглядаць пытанні звязаныя з утварэннем і дзейнасцю Літоўска-Беларускай ССР, неабходна разгледзець пошукі форм нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння ў перыяд Першай сусветнай вайны, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый, перадумовы беларуска-літоўскага супрацоўніцтва на савецкай аснове і ўсталяванне савецкай улады ў Літве і Беларусі.

У сакавіку 1917 г. прадстаўнікі літоўскіх палітычных партый, што дзейнічалі на тэрыторыі Расіі (частка літоўцаў апынулася ў Расіі падчас Першай сусветнай вайны), утварылі ў Петраградзе Літоўскі нацыянальны савет. Ён прызнаў, што "Літва" павінна быць вылучана ў самастойную адміністрацыйную адзінку, прычым кіраванне Літвой павінна быць даручана органам і асобам з асяроддзя самаго насельніцтва Літвы. Трэба заўважыць, што тэрмін "Літва" тлумачыўся літоўскім саветам не ў этнаграфічным, а ў губернска-адміністрацыйным сэнсе: літоўскія палітыкі ўключалі ў склад Літвы Ковенскую, Сувалкаўскую і Віленскую губерні цалкам, у тым ліку і паветы, дзе літоўцы складалі меншасць насельніцтва. Выказвалася патрабаванне ўвесці ў неакупіраваных паветах Віленскай губерні (Дзісенскім, Віленскім і Ашмянскім) літоўскую адміністрацыю. Для

рэалізацыі гэтых намераў Літоўскі нацыянальны савет 13 сакавіка 1917 г. пастанавіў сфарміраваць Часовы камітэт для кіравання Літвой у складзе 12 літоўцаў і 12 чалавек, прадстаўнікоў іншых народаў, што насяляюць край (6 беларусаў, 3 яўрэі, 2 палякі і 2 рускія). Часоваму камітэту неабходна было падрыхтаваць скліканне Устаноўчага сходу Літвы, які павінен быў вызначыць форму кіравання краем і стаўленне да суседзяў. Гэта праграма была даведзена да ведама Часовага ўрада [11, с. 25].

У сувязі з актывізацыяй нацыянальна-вызваленчых рухаў зараджалася тэндэнцыя ўсталявання федэратыўных дачыненняў паміж народамі былой Расійскай імперыі. Паўстала пытанне і пра месца беларускага народа ў будучай федэрацыі. Паколькі суседнія народы, а ў першыню літоўцы і палякі, выказвалі прэтэнзіі на беларускія этнічныя тэрыторыі, лёгкасці ў вырашэнні гэтай задачы не назіралася. Трэба было шукаць шляхі вырашэння гэтага пытання. Аднак сітуацыя ўскладнялася падзелам беларускіх зямель падчас Першай сусветнай вайны і развіццём нацыянальнага руху на дзвюх частках, а таксама знаходжаннем на тэрыторыі Беларусі Заходняга фронту расійскай арміі. Падчас Лютаўскай рэвалюцыі на тэрыторыі Беларусі склалася геапалітычная сітуацыя, якая яшчэ больш актуалізавала неабходнасць пастаноўкі і пошуку вырашэння праблемы дзяржаўна-палітычнага і нацыянальна-культурнага статусу краю. Аднак гэта пытанне так і засталося не вырашаным.

25 кастрычніка 1917 г. у Петраградзе адбылося ўзброенае паўстанне, пачалося ўсталяванне савецкай улады. Ізноў паўстае неабходнасць вырашэння пытання аб беларускай дзяржаўнасці і будучыні Беларусі. Ажыццяўленне праграмы бальшавікоў у галіне нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі мела пэўныя адметнасці. Найбольш складанай з’яўлялася праблема стварэння беларускай дзяржавы. Сітуацыя абвастралася тым, што ў вырашэнні гэтай задачы адначасова прымалі ўдзел некалькі палітычных сіл: 1) нацыянальныя партыі, якія гуртаваліся вакол ВБР; 2) цэнтральныя партыйныя і савецкія органы ўлады – ЦК РКП(б), ЦВК РСФСР і Народны камісарыят па справах нацыянальнасцей; 3) кіраўніцтва Заходняй вобласці і фронту – СНК і Аблвыкамзах; 4) Беларускі абласны камітэт.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі беларускі край быў падзелены Заходнім фронтам на дзве часткі. Заходняя частка – Гродзенская

губерня, большая частка Віленшчыны і частка Мінскай губерні знаходзіліся пад нямецкай акупацыяй. Другая частка Беларусі – Віцебская, Магілёўская і частка Мінскай губерні заставаліся пад уладай Расіі. У 1917 г. адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай у складзе Віцебскай, Віленскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў стала Заходняя вобласць. Органы савецкай ўлады Заходняй вобласці і яе кіраўнікі на неакупіраванай тэрыторыі праводзілі палітычную лінію, якая цалкам адпавядала інтарэсам урада Расіі. У лютым 1918 г. цэнтрам Заходняй вобласці становіцца Смаленск. У верасні 1918 г. III з'езд Саветаў перайменаваў Заходнюю вобласць у Заходнюю камуну (увайшлі Віцебская, Віленская, Магілёўская, Мінская і Смаленская губерні), якая праіснавала на беларускіх землях да ўтварэння БССР [10, с. 320].

У 1918 г. назіраецца актывізацыя супрацоўніцтва паміж беларускімі і літоўскімі камуністамі, арганізацыйна сфарміравалася сумесная камуністычная арганізацыя раёнаў Беларусі і Літвы, акупіраваных Германіяй у 1915 г. (Гродзенская, Віленская, Ковенская губерні). На Устаноўчым з'ездзе ў Вільні (1–3 кастрычніка 1918 г.) арганізацыя зацвердзіла сваю афіцыйную назву "Камуністычная партыя Літвы і Беларусі". Адбылося таксама аб'яднанне камуністаў-падпольшчыкаў, якія дзейнічалі ў раёнах Беларусі і Літвы, акупіраваных Германіяй у лютым – сакавіку 1918 г. Тут летам 1918 г. узнік Краявы камітэт Камуністычнай партыі Літвы і Беларусі [6, с. 44].

8 снежня 1918 г. Цэнтральны камітэт Камуністычнай партыі Літвы прыняў пастанову аб стварэнні Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада Літвы. 16 снежня 1918 г. быў апублікаваны Маніфест Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада, у якім абвяшчалася ўсталяванне савецкай улады ў Літве і была выкладзена праграма сацыялістычнага будаўніцтва. 23 снежня 1918 г. урад РСФСР прызнаў незалежнасць Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Літвы і яе Часовы ўрад [1, с. 59].

1 студзеня 1919 г. былі створаны Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь (ССРБ) і Часовы рабоча-сялянскі ўрад Беларусі на чале з З.Ф. Жылуновічам. I з'езд Кампартыі Беларусі вызначыў тэрыторыю рэспублікі ў межах Мінскай, Магілёўскай і Гродзенскай губерняў поўнасцю, Віцебскай губерні без трох паветаў, пяці паветаў Смаленскай губерні і па адным павеце з Віленскай і Сувалкаўскай губерняў. У такіх межах ССРБ праіснавала нядоўга.

У сярэдзіне студзеня 1919 г. ЦК РКП(б) зрабіў кардынальны паварот у адносінах да беларусаў і літоўцаў. 16 студзеня 1919 г. па ініцыятыве У. Леніна ЦК РКП(б) прыняў рашэнне аб перадачы РСФСР Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў. Адначасова кіраўніцтва РСФСР вылучыла план аб’яднання Беларусі і Літвы ў адзіную Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку Літвы і Беларусі (ЛітБел) [8, с. 29].

Для правядзення ў жыццё прынятай пастановы ў Беларусь камандзіраваўся ў якасці спецыяльнага ўпаўнаважанага ЦК РКП(б) А.А. Іофе. Але адносіны паміж ім і кіраўніцтвам рэспублікі адразу ўскладніліся. Такім рашэннем аб стварэнні ЛітБел былі не задаволены не толькі нацыянальна арыентаваныя бальшавікі, але і многія палітычныя лідары БССР. Яны лічылі, што падзел рэспублікі немэтазгодны і недапушчальны, што дадзеная ідэя “несумяшчальная з ідэалогіяй і палітыкай партыі”, што яна “супярэчыць разумнаму сэнсу”. Ад імя першага старшыні ўрада БССР З. Жылуновіча і яго сяброў (усяго 8 чалавек) у ЦК РКП(б) быў накіраваны пратэст з патрабаваннем адмяніць гэта рашэнне. Аўтары дакумента звярнулі ўвагу на тое, што стварэнне ССРБ з’яўлялася правам нацый на самавызначэнне, якое было зацверджана ў Канстытуцыі РСФСР, а рашэнне аб абмежаванні тэрыторыі ССРБ не адпавядае абвешчаным савецкай уладай прынцыпам вольнага развіцця нацый [9, л. 54–55; 5, с. 93]. Вынікам звароту стала зняцце з пасады З. Жылуновіча. Таксама у знак пратэсту супраць такіх метадаў вырашэння нацыянальнага пытання ў Беларусі, у канцы студзеня 1919 г. урад БССР пакінулі тры наркамы – Ф. Шантыр, У. Фальскі і Я. Дыла [7, с. 60].

Аб складаным становішчы ў Мінску паведамляў А.А. Іофе ў сваім пісьме ад 28 студзеня 1919 г. старшыні ЦВК Я. Свярдлову. Ен пісаў, што рашэнне ЦК натыкаецца на неверагоднае супраціўленне і не толькі адкрытае, але і скрыты сабатаж. “Беларусь павінна зліцца з Літвой, – катэгарычна сцвярджаў Іофе, – і ў падрыхтоўцы да гэтага трэба яшчэ больш старацца для таго, каб не пакінуць тут тых, хто здольны толькі шкодзіць” [2, с. 70]. Такім чынам, усе спробы захаваць цэласнасць тэрыторыі Беларусі не ўдаліся, заставалася толькі правесці рашэнне ЦК РКП(б) у жыццё, што і было зроблена.

Сярод беларускіх гісторыкаў ёсць меркаванне аб тым, што ідэя аб’яднання Савецкай Беларусі і Савецкай Літвы прапрацоўвалася і была распаўсюджана сярод партыйных і савецкіх кіраўнікоў яшчэ ў

1918 г., да абвяшчэння ССРБ. Да пачатку вызвалення ад нямецкай акупацыі Беларускі нацыянальны камісарыят прапанаваў праект арганізацыі Беларуска-Літоўскай нацыянальнай вобласці. Пазней нарада сялянскіх дэпутатаў Мінскай губерні 12 снежня 1918 г. "выказалася за неабходнасць брацкага аб'яднання Савецкай Беларусі з Савецкай Літвой. У снежні 1918 г., абапіраючыся на рашэнні нарады, Мінгубрэўкам выказаўся за "стварэнне Беларускай і Літоўскай працоўнай камуны на федэратыўных сувязях з Савецкай Расіяй" [5, с. 95]. У дні работы Першага з'езда КП(б)Б газета "Звязда" ў нумары ад 31 снежня 1918 г. на першай паласе змясціла артыкул пад назвай "Літоўска-Беларуская працоўная камуна". У артыкуле абгрунтоўвалася неабходнасць аб'яднання Літвы і Беларусі ў адну дзяржаўную адзінку. Аб'яднанне падтрымала "Дзянніца" – орган Белнацкама і Маскоўскай секцыіі РКП(б). У якасці галоўнай прычыны зліцця рэспублік на старонках перыядычнага друку вызначаўся знешнепалітычны фактар.

Як вядома, ідэя стварэння ЛітБел узнікла сярод кіраўніцтва ЦК РКП(б) і затым была праведзена ў жыццё. Партыйныя арганізацыі КП(б)Б і КП(б)Л ніякіх адносін да прыняцця рашэння аб утварэнні ЛітБел не мелі.

Рашэнне аб стварэнні Літоўска-Беларускай ССР праводзілася ў жыццё ў некалькі этапаў. Асноўнымі юрыдычнымі дакументамі, якія былі падставай для ўтварэння ЛітБел, сталі рашэнні Першага Усебеларускага з'езда Саветаў (2–3 лютага 1919 г.) і Першага з'езда Саветаў рабочых, беззямельных, малазямельных і чырвона-армейскіх дэпутатаў Літвы (17–21 лютага 1919 г.). Завяршальным момантам стала аб'яднанае пасяджэнне ЦВК Літоўскай і Беларускай ССР 27 лютага 1919 г., на якім быў створаны адзіны Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Літоўска-Беларускай ССР і абраны ўрад рэспублікі. У склад Літоўска-Беларускай ССР увайшлі тэрыторыі Віленскай, Мінскай, часткі Ковенскай, Гродзенскай і Сувалкаўскай губерняў з насельніцтвам ад 4 да 7,5 млн чалавек [12, с. 382].

2 сакавіка 1919 г. СНК зацвердзіў афіцыйную назву – Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Літвы і Беларусі (ССРЛіБ) і дзяржаўную сімволіку. Аднак у афіцыйных дакументах і літаратуры часта выкарыстоўвалася "тэлеграфнае" скарачэнне назвы рэспублікі – ЛітБел. Першы з'езд Саветаў Літвы ўрачыста пракламіраваў стварэнне адзінай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі

і Літвы [8, с. 13]. ЦВК і ўрад ЛітБел згадзіліся на перадачу РСФСР Дзісенскага павета Віленскай губерні і Рэчыцкага павета Мінскай губерні. Літоўска-Беларуская рэспубліка фактычна складалася толькі з беларускіх губерняў. На тэрыторыі этнічнай Літвы ўлада належала Тарыбе, якая была створана 11 снежня 1917 г. пры цеснай падтрымцы Германіі.

Што датычыцца прычын аб'яднання Беларускай і Літоўскай ССР у адзіную дзяржаву, то даследчыкі выдзяляюць унутрыпалітычныя і знешнепалітычныя фактары, якія паўплывалі на гэты працэс. Засяродзім увагу на найбольш важных з іх. Прычыны такога кроку былі афіцыйна сфармуляваны ў пастановах і рашэннях ЦК РКП(б), выступленнях старшыні Усерасійскага ЦВК Я.М. Свярдлова і прадстаўніка ЦК РКП(б) у Беларусі А.А. Іофе, якія затым фактычна паўтарыліся ў рашэннях Першага Усебеларускага з'езда Саветаў, Першага з'езда Саветаў Літвы.

У дэкларацыі Першага з'езда Саветаў БССР "Аб аб'яднанні савецкіх рэспублік Літвы і Беларусі" былі пазначаны дзве прычыны стварэння ЛітБел. Па-першае, гаварылася аб "гістарычнай агульнасці працоўных Беларусі і Літвы". Па-другое, аб'яўлялася "неабходнасць хутчэйшага разгрому белагвардзейскага беларуска-літоўскага ўрада", у сувязі з тым, што Літоўская Тарыба і Рада БНР выступаюць адзіным контррэвалюцыйным фронтам. Такім чынам, аб'яднаная буферная рэспубліка стваралася і з мэтай барацьбы супраць БНР і абвешчанай буржуазнай Літвы [3, с. 105–106]. Таксама, калі прымалася рашэнне аб аб'яднанні, быццам бы ўлічвалася і агульнасць гістарычнага мінулага, эканамічных умоў і інтарэсаў абедзвюх рэспублік, іх геаграфічнага палажэння, аб чым ґаварылася ў пастанове Прэзідыума Усерасійскага ЦВК аб прызнанні незалежнасці ССРБ, прынятай 31 студзеня 1919 г. [8, с. 37].

Абвяшчэнне ЛітБел таксама з'яўляецца праяўленнем непаслядоўнай нацыянальнай палітыкі бальшавікоў. Утварэнне аб'яднанай рэспублікі было абумоўлена неспрыяльнай для Савецкай Расіі міжнароднай сітуацыяй і непасрэдна звязана з праблемай абмежавання тэрыторыі ССРБ. ЦК РКП(б), робячы такі крок, лічыў, што, аб'яднаўшыся, дзве невялікія рэспублікі ЛССР і ССРБ маглі больш эфектыўна супрацьстаяць захопніцкім памкненням Польшчы. Пры гэтым акцэнт рабіўся на неабходнасці стварэння буфера, "фарпоста пралетарскай рэвалюцыі на заходняй граніцы Расіі, які быў

прызваны перагарадзіць шлях імперыялістычным драпежнікам у цэнтр рэвалюцыі – Савецкую Расію” [8, с. 37].

Важнае месца пры стварэнні дзяржавы таксама мела тэрытарыяльнае пытанне. У Літвы і Беларусі меліся спрэчныя тэрыторыі: перш за ўсё Вільня і Віленскі край. Часовы ўрад Літоўскай ССР лічыў, што граніца Літвы з Беларуссю павінна праходзіць прыблізна па лініі першай нямецкай акупацыі, гэта значыць уключаў у склад Літвы Вільню, Віленскую вобласць, а таксама значную частку Гродзенскай губерні. Прадстаўнікі Заходняй камуны таксама лічылі Віленскую губерню сваёй, і імкнуліся адразу пасля адступлення немцаў уключыць яе ў свой склад і распаўсюдзіць на яе сваю ўладу. ЦК РКП(б) не мог вырашыць Віленскае пытанне на карысць беларусаў, бо гэта магло пагоршыць яго адносіны не толькі з савецкім урадам Літвы, але і настроіць супраць савецкай улады шырокія колы літоўскага насельніцтва. Таму адмова дзяліць спрэчныя тэрыторыі, аб’яднанне ў адну дзяржаву здымала б гэтыя пытанні. Тэрытарыяльны фактар, як адну з галоўных прычын стварэння Літоўска-Беларускай рэспублікі, разглядаў непасрэдны ўдзельнік тых падзей В. Кнорын. У сваіх успамінах у 1922 г. ён пісаў, што аб’яднаць Літву і Беларусь было вельмі важна, таму што шэраг тэрыторый з’яўляліся спрэчнымі ў нацыянальных адносінах, і на іх у аднолькавай ступені прэтэндавалі савецкія ўрады Беларусі і Літвы [4, с. 89].

Сярод унутраных прычын утварэння Літоўска-Беларускай ССР трэба адзначыць наступны факт: аб’яднанне рэспублік дазваляла вырашыць канфлікт паміж ЦК РКП(б) і ЦК КП(б)Б. Група А. Мяснікова, якая ўтрымлівала за сабой большасць ва ўрадзе ССРБ і ЦК КП(б)Б, дэманстравала незалежнасць ад цэнтра і дазваляла сабе сабатаваць рашэнні ЦК РКП(б)Б. Таму стварэнне ЛітБел і адпаведна новага ўрада давала магчымасць хутка і без лішніх складанасцяў адхіліць абласнікоў ад улады. Ніводны з лідараў ССРБ не атрымаў значных пасад ва ўрадзе ЛітБел [2, с. 406].

Фактычна аб’яднанне дзвюх рэспублік у адзіную Літоўска-Беларускую ССР адбылося 27 лютага 1919 г. на сумесным пасяджэнні ЦВК абедзвюх савецкіх рэспублік. Старшынёй аб’яднанага ЦВК ЛітБел быў абраны К. Цыхоўскі, у склад Прэзідыума таксама ўвайшлі І. Уншліхт, Я. Далецкі, С. Іваноў і Р. Пікель. Старшынёй Савета Народных Камісараў, у якім не было

беларусаў, стаў В. С. Міцкявічус-Капсукас, які адначасова ўзначаліў і Наркамат па замежных справах. У кіруючыя органы ўлады ЛітБел – ЦК КП(б)ЛіБ, ЦВК, СНК, Савет Абароны, наркаматы – беларускія дзеячы не папалі. Самую высокую пасаду ў кіраўніцтве рэспублік дзвюх народаў займаў выдатны беларус – А. Чарвякоў – яму даверылі быць намеснікам наркама асветы [8, с. 44]. З. Жылуновіча ў пачатку лютага 1919 г. накіравалі на журналісцкую працу ў Харкаў, а А. Мяснікова ў маі 1919 г. камандзіравалі на Усходні фронт у рангу камандуючага Паволжскім фронтам [54, с. 404]. 27 лютага 1919 г. таксама былі створаны 16 наркаматаў, у тым ліку наркаматы ваенных спраў, унутраных спраў, дзяржаўнага кантролю, асветы, харчавання, юстыцыі, працы, фінансаў, сацыяльнага забеспячэння, шляхоў зносін, земляробства і г.д. [12, с. 383] Наркамы павінны былі ажыццяўляць дэкрэты і пастановы з'ездаў Саветаў, ЦВК, дапамагаць мясцовым органам улады ў іх дзяржаўнай, гаспадарчай і культурнай дзейнасці. Таксама Прэзідыуму ЦВК было даручана распрацаваць праект Канстытуцыі Літоўска-Беларускай ССР.

Фарміраванне дзяржаўных органаў ЛітБел знаходзілася пад пільным кантролем ЦК РКП(б). Назначэнне на ўсе ключавыя пасады ва ўрадзе абавязкова праводзілася пасля зацвярджэння кандыдатуры ў ЦК РКП(б). Аб гэтым сведчаць падрабязныя паведамленні прадстаўніка ЦК РКП(б) А.А. Іофе ў Маскву. Ключавыя пасады ў Літоўска-Беларускай ССР узначалілі толькі прадстаўнікі літоўскай савецкай палітычнай эліты. У выніку аб удзеле беларускай палітычнай эліты ў кіраўніцтве ЛітБел гаварыць не даводзіцца. У цэлым літоўскі элемент у сумеснай дзяржаве пераважаў. Аб гэтым сведчыць сама назва рэспублікі Літоўска-Беларуская ССР. Сталіцай наваўтворанай дзяржавы стала Вільня. З ваенна-стратэгічнага пункту гледжання на ролю сталіцы больш падыходзіў Мінск. За размяшчэнне ўрада ў Мінску выступалі ўсе лідары БССР, але ў чарговы раз вымушаны былі падпарадкавацца партыйнаму кіраўніцтву ў Маскве. Акрамя таго савецкая ўлада ў Беларусі карысталася большай падтрымкай, чым у Літве.

З утварэннем Літоўска-Беларускай ССР узнікла неабходнасць зліцця кампартыі Літвы і Беларусі. З 4 па 6 сакавіка 1919 г. у Вільні прайшоў Аб'яднаўчы з'езд КП(б)Б і КП(б)Л. На з'ездзе была створана адзіная партыйная арганізацыя рэспублікі, быў выбраны

Цэнтральны Камітэт КП(б)ЛіБ колькасцю 15 чалавек. У склад кіраўніцтва кампартыі ўвайшлі В. Міцкявічус-Капсукас, К. Цыхоўскі, А. Мяснікоў, В. Кнорын, Я. Далецкі і іншыя. 6 сакавіка 1919 г. ЦК КП(б)ЛіБ выбраў Прэзідыум ЦК КП Літвы і Беларусі, старшынёй Прэзідыума стаў В. Міцкявічус-Капсукас, сакратаром – В. Кнорын. Таксама быў утвораны адзіны Камуністычны Саюз Моладзі Літвы і Беларусі [14, с. 36].

28 лютага 1919 г. ЦВК ЛітБел выдаў Дэкларацыю аб знешняй палітыцы, у якой змяшчаўся заклік да ўсіх урадаў прызнаць ЛітБел і ўступіць з ёй у зносіны, дэкларавалася гатоўнасць "вырашаць усе спрэчныя пытанні палюбоўна і міралюбіва". Яшчэ 16 лютага 1919 г., падчас фарміравання ўрадавых органаў і аб'яднання Савецкай Літвы і Беларусі, Часовы рабоча-сялянскі ўрад Літвы і ЦВК Саветаў ССРБ па ўзаемным пагадненні накіравалі польскаму ўраду ноту пратэсту ў сувязі з гвалтоўным уварваннем польскіх узброеных сіл у Беластоцкі павет Гродзенскай губерні з прапановай стварыць змешаную камісію для мірнага ўрэгулявання тэрытарыяльных пытанняў. Але нота засталася без адказу [3, с. 110].

1 сакавіка 1919 г. СНК ЛітБел звярнуўся з нотай да ўрадаў ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі і Японіі, у якой даў згоду на ўдзел у канферэнцыі на Прынцавых астравах для вырашэння спрэчных пытанняў паміж урадамі, што стварыліся на тэрыторыі Расійскай імперыі. Аднак Польшча і краіны Антанты не прызналі ЛітБел у якасці суб'екта міжнароднага права і адмовіліся ўступаць з ёю ў зносіны.

2 сакавіка 1919 г. ЦВК ЛітБел выступіў з новай дэкларацыяй, у якой звярнуў увагу на факт ігнаравання польскім урадам папярэдніх зваротаў органаў улады рэспублікі і пацвердзіў сваю гатоўнасць вырашаць мірным шляхам спрэчныя пытанні [13, с. 86]. На працягу лютага – сакавіка 1919 г. урад Літоўска-Беларускай ССР імкнуўся прадухіліць магчымую вайну з Польшчай, але дыпламатычным шляхам зрабіць гэта было немагчыма. Краіны Антанты і Германія падтрымлівалі захопніцкую палітыку Польшчы.

Пазіцыю ўрада Літоўска-Беларускай ССР падтрымліваў і ўрад РСФСР, які таксама дамагаўся спынення польскага наступлення на ўсходзе. Аднак усе намаганні савецкай дыпламатыі таксама былі дарэмнымі. Польскі ўрад ішоў на канфрантацыю і адмаўляўся ад якіх-небудзь дыпламатычных кантактаў з Літоўска-Беларускай Са-

вецкай Рэспублікай, таму што гэта азначала б прызнанне факта самавызначэння беларускага і літоўскага народаў і неабходнасць уступіць у мірныя перагаворы. Таму быў выбраны крок не прызнаваць савецкія рэспублікі. У тых умовах наступленне польскіх войск на землі Беларусі і Літвы стала непазбежным.

8 красавіка 1919 г. ЦВК ЛітБел аб'явіў рэспубліку на ваенным становішчы. 19 красавіка 1919 г. ствараецца Савет абароны Літвы і Беларусі. Польшча пачынае ваенныя дзеянні супраць Савецкай Расіі і першай ахвярай становіцца ЛітБел, большая частка тэрыторыі якой была акупіравана. У склаўшыхся ўмовах паўстала пытанне аб немэтазгоднасці існавання ЛітБел. У сярэдзіне ліпеня 1919 г. у Мінск прыбыў член Палітбюро ЦК РКП(б), наркам па справах нацыянальнасцяў І. Сталін. Ён запатрабаваў распусціць цэнтральныя органы ЛітБел. "Канстатую поўную непатрэбнасць урада і Мінскага Савета абароны, неабходнасць іх самароспуску і ўваходжання іх членаў у органы фронту" – катэгарычна заявіў наркам. 14 ліпеня 1919 г. у Мінску на нарадзе кіруючых работнікаў Літоўска-Беларускай ССР І. Сталін абвясціў рашэнне ЦК РКП(б) аб ліквідацыі ЛітБел і перадачы ўлады на неакупіраванай частцы тэрыторыі Беларусі Мінскаму губернскаму рэвалюцыйнаму камітэту, што на яго думку, павінна было служыць умацаванню фронту, скарачэнню попыту на работнікаў зверху. Кіруючыя кадры былі накіраваны на фронт [6, с. 63].

Кіраўніцтва ЛітБел не пагадзілася з ліквідацыяй рэспублікі. Нягледзячы на гэта, дзейнасць органаў улады Літоўска-Беларускай ССР паступова згортваецца. 17 ліпеня 1919 г. на сумесным пасяджэнні ЦВК ЛітБел, Мінскага Савета, прафсаюзных арганізацый было прынята рашэнне аб ліквідацыі Савета Абароны, які спыніў сваю дзейнасць 18 ліпеня. Уся справа абароны Літоўска-Беларускай ССР перадавалася расійскай Чырвонай Арміі. Апошняе пасяджэнне ўрада ЛітБел адбылося 19 ліпеня 1919 г. У гэты ж дзень СНК ЛітБел вырашыў перадаць Мінскаму губернскаму ВРК усе правы народных камісарыятаў. 25 ліпеня 1919 г. наркаматы Літоўска-Беларускай ССР былі перайменаваны ў аддзелы Мінскага губернскага ВРК. З канца ліпеня 1919 г. ні ЦВК ЛітБел, ні СНК рэспублікі фактычна не кіравалі дзяржаўным жыццём і не выконвалі сваіх функцый. І нягледзячы на адсутнасць юрыдычных дакументаў аб ліквідацыі ЛітБел, рэспубліка як дзяржаўнае ўтварэнне фактычна

перастала існаваць. У пачатку жніўня 1919 г. пачала сваю дзейнасць Ліквідацыйная камісія эвакуіраваных устаноў Літвы і Беларусі. У жніўні перастаў існаваць і Мінскі губернскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт. Неакупіраваныя тэрыторыі ЛітБел былі далучаны да суседніх губерняў РСФСР.

Фактычна Літоўска-Беларуская ССР перастала існаваць восенню 1919 г., таму што ў гэты час урад РСФСР уступіў у непасрэдныя адносіны з Літоўскай Тарыбай. 11 верасня 1919 г. кіраўніцтва РСФСР прапанавала ўраду Літвы ўступіць у перамовы аб падрыхтоўцы і падпісанні мірнага дагавора і тым самым фактычна прызнала буржуазны ўрад Літвы. Пасля падпісання 12 ліпеня 1920 г. мірнага дагавора паміж РСФСР і Літвой Літоўска-Беларуская ССР юрыдычна спыніла сваё існаванне. Аднак, як лічаць шматлікія даследчыкі, гэтая дамова для Беларусі не мела юрыдычнай сілы, бо яна супярэчыла існаваўшым нормам міжнароднага права.

Такім чынам, Літоўска-Беларуская ССР праіснавала вельмі непрацяглы час – меней чым паўгода. Аднак да сённяшняга часу ёсць пытанні, па якіх у гісторыкаў існуюць значныя разыходжанні. Пры стварэнні ЛітБел вызначальную ролю адыгралі знешнія сілы. Савецкае партыйнае кіраўніцтва ў Маскве ствараючы рэспубліку дзейнічала з асабістых інтарэсаў расійскай і міравой пралетарскай рэвалюцыі. Сярод унутраных прычын утварэння Літоўска-Беларускай рэспублікі, з пункту гледжання савецкага ўрада, трэба адзначыць неабходнасць сур'ёзнай барацьбы супраць буржуазнага нацыяналізму. У той час вельмі актыўна на тэрыторыі Ковеншчыны і Гродзеншчыны дзейнічала Літоўская Тарыба, з якой супрацоўнічала Рада БНР. Ствараючы ЛітБел, савецкае кіраўніцтва ў Маскве зыходзіла з таго, што тым самым яны змогуць нанесці рашучы ўдар па літоўскаму і беларускаму нацыяналізму ў выглядзе Літоўскай Тарыбы і Рады БНР. Трэба адзначыць таксама той факт, што стварэнне Літоўска-Беларускай ССР, як сцвярджал яеі арганізатары, не з'яўлялася арганічнай патрэбнасцю двух народаў, якія заўсёды былі добрымі суседзямі. Пасля таго, як тэрыторыя Беларусі і Літвы была акупіравана палякамі, ЛітБел фактычна перастала існаваць, бо патрэбнасці ў гэтым дзяржаўным утварэнні ва ўрада РСФСР ужо не было, быў узяты курс на супрацоўніцтва з урадам буржуазнай Літвы.

## Выкарыстаная літаратура


1. Великий Октябрь в судьбах белорусского и литовского народов: Материалы научн. конф. посвященной 60-летию обр. Литовско-Белоруской ССР. – Минск., 1981. – 117 с.
2. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII-пач.XXI ст. / [А.А. Каваленя і інш.]. – Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – Кн.1. – Мінск, 2011. – 583 с.
3. Знешняя палітыка Беларусі: зборнік дакументаў і матэрыялаў / Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь [і інш.]; [Склад.: У.М. Міхнюк, Рэдкал.: І.І Антановіч (старшыня) і інш.] – Т. 1. (1917-1922 гг.). Мінск.: БелНДІДАС: Выдавецкі цэнтр БДУ, 1997. – 395 с.
4. Кнорин В.Г. Избранные статьи и речи / Сост.: Н.В. Кузнецов и др. – Минск.: Беларусь, 1990 – 303 с.
5. Круталевич В.А. История Беларуси: Становление национальной державности (1917-1922 гг.) / В.А. Круталевич – 2-е изд., доп. – Минск.: Право и экономика, 2003. – 592 с.
6. Круталевич В.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917-1945 гг.) / В.А. Круталевич, І.А. Юхо – 2-е изд., доп. – Мінск: "Беларуская навука", 2010 – 238 с.
7. Ладысеў У.Ф. Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917-1939 гг.) / У.Ф. Ладысёў, П.І. Брыгадзін – Мінск.: БДУ, 2003, – 307 с.
8. Малыхіна Л.Ю. Гістарыяграфія Літоўска-Беларускай ССР / Л.Ю. Малыхіна, У.М. Міхнюк. – Брэст: Выдавецтва БДТУ, 2005. – 119 с.
9. НА Рэсп. Беларусь. – Ф. 4683. Воп. 3. – Спр. 478. – Л. 54–55.
10. Рамановіч С.П. Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўладкаванне Беларусі (1917-1922 гг.) / С.П. Рамановіч // Октябрь 1917 года в судьбе мировой цивилизации / редкол.: М.П. Косцюк (гл. ред.) [и др.] – Минск: Белорусская наука, 2008 – С. 320-324.
11. Рудовіч С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 г. / С. Рудовіч. Ін-т гісторыі Нац. акад. навук Беларусі – Мінск.: НВК "Тэхналогія", 2001 – 200 с.
12. Ціхаміраў А. Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная рэспубліка / А. Ціхаміраў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі – Мінск., 1997. – Т. 4. – С. 382-384.

13. Ціхаміраў А.В. Міжнародныя аспекты фарміравання беларускай дзяржаўнасці ў 1914-1921 гг. / А. Ціхаміраў // Внешняя политика Беларуси в исторической ретроспективе. материалы Международной научной конференции 24-25 мая 2002 г. – Минск.: “Адукацыя і выхаванне”, 2002. – С. 116-125.

14. Шкляр Е.Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией (1919-1920 гг.) / Е.Н. Шкляр – Минск.: Госиздат БССР, 1962. – 178 с.

## СОЛДАТСКОЕ ДВИЖЕНИЕ – ДВИЖУЩАЯ СИЛА ФЕВРАЛЬСКОЙ И ОКТЯБРЬСКОЙ РЕВОЛЮЦИЙ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ

Богданович А.И. г. Минск, БНТУ

Солдатское движение на территории Беларуси как самостоятельная проблема еще не стало предметам основательного исследования, хотя именно с присутствием армии и боевыми действиями связано социально-экономичное положение в Беларуси и, в особенности, революционные потрясения 1917 – 1918 гг. Отдельные аспекты этой проблемы затрагивались в многочисленных общих исследованиях отечественных и зарубежных историков. В данной статье мы попробуем проследить некоторые наиболее малоизвестные факты антивоенной и антиправительственной борьбы солдат Западного фронта на территории Беларуси в предверии Октябрьской революции.

Первые солдатские волнения были вызваны массовой мобилизацией, которая началась на территории Беларуси накануне официального объявления войны Германией и ее союзниками 18 июля 1914 года. В соответствие с законом о всеобщей воинской повинности 1906 г. мобилизация проводилась строго по территориальному принципу. Все военнообязанное мужское население белорусских губерний в возрасте от 21 до 43 лет (а с 1915 г. с 18 до 43 лет) в соответствия с мобилизационными планами и соответствующими повестками военного ведомства должны были явиться на мобилизационные пункты для пополнения рядов русской армии.

Мобилизованные из запаса солдаты, преимущественно крестьяне, часто в поисках спиртного начинали громить поместья мест-